что вклад отраслей, входящих в сферу туризма, в ВВП Беларуси колеблется в пределах 3,7-6,1 % (в мире эти цифры составляют в среднем 5-10 %). Согласно данным Белстата за 2021 год, в сфере туризма в Беларуси были заняты 247,7 тыс. человек (или 5,8 % от общей численности занятого населения) [3, с.271-275].

За последние пять лет количество туристов, путешествующих по территории Беларуси, увеличилось на 60%. В 2023 году туристическую деятельность в стране осуществляло 1108 организаций, услугами которых воспользовались 2,5 млн. туристов и экскурсантов. Беларусь посетили 1,6 млн. иностранных граждан из 174 стран. По турам в пределах страны путешествовали свыше 1,7 млн. белорусов. Осуществляли деятельность 2409 субъектов агроэкотуризма [4, с. 23].

ЛИТЕРАТУРА

1. Сардаров, А.С. Путетворение: история и культура белорусских дорог / А.С. Сардаров. Минск: Беларуская навука, 2009. – 191с.

2. Шаповал, Г.Ф. История туризма Беларуси / Г.Ф. Шаповал. Минск: РИВШ, 2006. – 166 с.

3. Статистический ежегодник Республики Беларусь, 2022: Национальный статистический комитет Республики Беларусь. – Минск, 2022. – 374 с.

4. Туризм и туристические ресурсы в Республике Беларусь, 2023: Статистический сборник. Национальный статистический комитет Республики Беларусь. Минск, 2023. – 28 с.

УДК 37.014.54(476) “18/19”

В.М. Астрога, дац., канд. гіст. навук
(БДТУ, г. Мінск)

## ШЛЯХІ ПАЛЯПШЭННЯ МАТЭРЫЯЛЬНАГА СТАНОВІШЧА ВЯСКОВАГА НАСТАЎНІЦТВА БЕЛАРУСІ (ДРУГ. ПАЛ. XIX – ПАЧ. XX ст.)

Як сведчаць дакументы, у паслярэформенны перыяд памер заробка вясковага настаўніка не толькі ў губерні, а ў павеце і нават воласці быў розным і на працягу ўсёй другой паловы XIX ст. вагаўся звычайна ад 150 да 250 руб. На мяжы стагоддзяў дырэкцыі прызналі неабходным яго павелічэнне да 300 руб. 3 мая 1908 г. быў прыняты закон, які датычыўся выдзялення новых грашовых сродкаў на патрэбы народнай адукацыі ў памеры 6 900 000 руб. Для існаваўшых і новых школ казна давала па 390 руб. на аплату працы выкладчыкам (па 360 – настаўнікам, і па 30 тым, хто выкладаў Закон Божы) [1, л. 24]. Астатнія выдаткі на школы павінны былі пакрывацца за кошт мясцовых земскіх

і сялянскіх сродкаў. Так, з 1908 г. з адпушчанага дзяржаўнага крэдыту стала магчыма павялічыць заробак усім настаўнікам і настаўніцам Магілёўскай губерні да 360 руб. Ва ўсіх астатніх – часткова, з-за недахопу сродкаў, але планавалася ў хуткім часе так паставіць справу, каб "ва ўсёй акрузе не было выкладчыка, які б атрымліваў менш за 360 рублёў" [2, с. 475–476]. У дачыненні да настаўнікаў царкоўна-прыходскіх школ такое рашэнне было прынята толькі 12 ліпеня 1913 г. З 1911 г. царкоўныя школы ўвайшлі ў земскую школьную сетку, і іх настаўнікам зарплату цалкам выплачвала дзяржава.

Для большасці настаўнікаў іх даход складаўся выключна з заработнай платы. Гэтыя грошы, у сувязі з імклівым падаражаннем харчоў і спажывецкіх тавараў, ледзьве дазвалялі зводзіць канцы з канцамі. Але пры пэўных спрыяльных абставінах, жаданні, спрыце і выдатнай працы настаўнікаў іх матэрыяльнае становішча магло некалькі палепшыцца. Грашовыя ўзнагароды можна было атрымаць за бездакорную дадатковую працу ў школе. Так, у 1884 г. Віцебская дырэкцыя прыняла рашэнне аб выдачы прэмій у памеры 15-20 руб. настаўнікам за выкладанне ў якасці факультатываў рамяства і рукадзелля. У спісе былі 10 чалавек, сярод іх Ф. Васільеў з Вялішковічскага, І. Авегасенкаў з Бялецкага, Н. Лосева з Старшальска-га, Н. Заяц з Азярышчынскага народных вучылішчаў і інш. За выкладанне спеваў і стварэнне царкоўнага хору А. Гузоўскі з Лагажскага і М. Красаніцкі з Обальскага вучылішчаў атрымалі дадаткова па 10 руб. [3, л. 3, 6]. Настаўніца Падзейкаўскага вучылішча Магілёўскай губерні Г. Арлова па сваёй ініцыятыве з 1910 г. пачала вучыць дзяўчынак абутковаму майстэрству. Вырабы вучаніц трапілі ў павятовую земскую ўправу і былі ацэнены вельмі высока. Земскія ўлады прызналі справядлівым не толькі аднаразова ўзнагародзіць настаўніцу, але выдаваць ёй грошы штомесяц: 60 руб. за дадатковую працу і 20 руб. – на пакупку неабходных для заняткаў матэрыялаў. Такія сумы адпускаліся Магілёўскай земскай управай Ш. Халастовай з Сергіеўскага вучылішча за выкладанне вязання, шыцця і вышывання, а таксама некаторым іншым настаўнікам [4, л. 2–9]. Згодна дадзеным па Віцебскай дырэкцыі за 1914 г. у якасці дадатковых заняткаў называліся ручная праца і рамяство, сельская гаспадарка, рукадзелле, спевы, гімнастыка. Частка настаўнікаў працавала на грамадскіх пачатках. Так, першая настаўніца Я. Купалы А.В. Сонцава была чалавекам з шырокімі і differentнабаковымі інтарэсамі. Яна добра іграла на фартэпіяна, дасканала ведала французскую і нямецкую мовы і, выкарыстоўваючы высокі адукацыйны ўзровень, давала прыватныя ўрокі дзецям мясцовых багацеяў [5, с. 55].

Вялікая ўвага напрыканцы XIX ст. удзялялася выкладанню асноў сельскай гаспадаркі. Каб заахвоціць у гэтым настаўнікаў, іх імкнуліся

падтрымаць матэрыяльна. Так, у 1899 г. па загаду апекуна акругі дырэкцыі збіралі звесткі аб тых, хто дамогся найбольшых поспехаў у школьным садаводстве. Настаўнікі рабілі апісанні зробленых на працягу года работ, збіралі звесткі аб распаўсюджванні сярод мясцовага насельніцтва карысных ведаў па сельскай гаспадарцы (гутаркі, сумесная праца, раздача добрых сартоў насення, прывітых дрэўцаў і інш.). Дастойныя атрымалі спецыяльныя прэміі. У верасні 1903 г. у Магілёве была арганізавана выстава садаводства. На ёй былі прадстаўлены лепшыя экзэмпляры розных сельскагаспадарчых культур, якія вырасцілі на прышкольных участках педагогі і іх вучні. Самых старанных настаўнікаў, сярод якіх значыліся С. Ідаловіч з Аршанскага і П. Машкоўскі з Чавускага паветаў, узнагародзілі граматамі і грашовымі падарункамі [6, л. 110–116. ].

Дадатковыя сродкі – штогод па 20 руб. альбо аднаразовыя дапамогі маглі атрымаць тыя педагогі, якія з дазволу дырэкцый ў выпадку занятасці мясцовага святара выкладалі Закон Божы. У 1908 г. выйшла спецыяльная пастанова “Аб узнагароджанні выкладчыкаў Закону Божага ў пачатковых вучылішчах”, якая стаўку законанастаў-ніка ў памеры 30 руб. у год размяркоўвала такім чынам: 2/3 атрымліваў настаўнік, які выкладаў гэты прадмет, і 1/3 – святар-наглядальнік. Рашэнне матэрыяльна заахвочваць настаўнікаў за арганізацыю народных чытанняў і святаў пры вучылішчах прыняў у 1907 г. Епархіяльны Вучылішчны савет Гродзенскай губерні. Невялікія грошы можна было атрымаць таксама па рашэнню дырэкцый ці валасных сходаў за загадванне бібліятэкамі і продаж літаратуры мясцоваму насельніцтву з кніжных складоў.

Не шкадавалі сяляне грошай тым настаўнікам, якія змаглі добра падрыхтаваць іх дзяцей да здачы экзамена на льготнае пасведчанне па адбыванню вайсковай павіннасці. Напрыклад, у Бытчанскім вучылішчы Мінскай губерні ў 1880-я гг. ад сельскага грамадства настаўнік атрымліваў 150 руб. “жалавання”, на 15 руб. ссыпкі і па 10 руб. за кожнае льготнае пасведчанне. У Ратушынскім вучылішчы гэтай жа губерні вытрымалі іспыт 8 вучныў трэцяга класа, што дало настаўніку дадаткова 80 руб. [7, л. 175, 204]. А ў Зачысцкай школе В. Гласко ніякіх даплат з 1875 да 1883 г. не атрымлівала, бо ні адзін яе вучань не змог атрымаць льготнае пасведчанне. Сяляне былі вельмі за гэта незадаволены сваёй настаўніцай і нават пераcталі пасылаць дзяцей у школу [8, л. 140]. Такім чынам, узровень ведаў хлопчыкаў быў не толькі адзнакай старанняў і працы іх настаўніка, але і дадатковым матэрыяльным стымулам.

9 лістапада 1906 г. Міністэрства народнай асветы дазволіла народным настаўнікам браць удзел ва ўстановах дробнага крэдыту, якія

маглі стварацца з мэтай аблегчыць зацікаўленым у вытворчасці асобам набыць неабходны інвентар, узяць пазыкі і г.д. Але гэтыя ўстановы развіваліся вельмі марудна, асабліва на вёсцы. Таму прызнаваўся пажаданым удзел у іх вясковых настаўнікаў, як з прычыны лепшай арганізацыі, так і з мэтай прадстаўлення ім дадатковага заробку пры ўмове, што гэтая праца не будзе адмоўна ўплываць на выкананне іх прамых школьных абавязкаў.

Пэўны даход сям'і настаўніка даваў і надзел зямлі, які звычайна быў пры кожным вучылішчы. Часам, уладкоўваючы працу настаўнікаў, дырэкцыі звярталіся ў валасныя праўленні з просьбамі "прымаючы да ўвагі абмежаванасць сродкаў для жыцця уступіць хоць невялікі агарод, які мог служыць немалым падспор'ем у сціплым гаспадарчым бюджэце". Але халастыя настаўнікі звычайна агародам не займаліся і на летнія канікулы ездзілі на радзіму да бацькоў, зямлю каля школы здавалі за некалькі рублёў ў арэнду. Сямейныя ў асноўным заставаліся на месцы, працуючы разам з дзецьмі на прышкольнай пляцоўцы. Адзін з настаўнікаў Слонімскага павета ганарыўся, што ён "ніколі не купляе ні ягад, ні гародніны… маліна, парэчкі, агрэст, клубніцы, грушы, яблыні – усё тут ёсць. Разведзены кветкі-летнікі" [9, с. 22 ]. Некаторыя трымалі свойскіх жывёл і птушак, займаліся сельскай гаспадаркай на арэнднай зямлі, як, напрыклад, І. Пуерынаў з Хадчанскага вучылішча Магілёўскай губерні. У яго былі "дзве каровы, цялё, свае зерне і мука" [10, л. 50].

Такім чынам, у большасці выпадкаў асноўным даходам вясковых настаўнікаў была заработная плата. Недастатковае матэрыяльнае забеспячэнне ў шэрагу выпадкаў з'яўлялася прычынай своеасаблівай натуралізацыі гаспадарак многіх педагогаў, вымушала іх шукаць дадатковыя крыніцы папаўнення бюджэту. Знайсці дадатковы заробак па аб'ектыўных абставінах вясковым "вучачым" было значна цяжэй, чым гарадскім. Таму ўзгаданыя вышэй шляхі паляпшэння матэрыяльнага дабрабыту былі абмежаванымі, часовымі, залежалі ад мясцовых умоў і выкарыстоўваліся толькі нязначнай часткай настаўніцтва.

ЛІТАРАТУРА

1. НГАБ. Ф. 325. Воп. 1. Спр. 50.

2. 1120 новых «сеятелей разумного» в Северо-Западном крае // Народное образование в Виленском учебном округе. – 1908. – № 11. – С. 475–476.

3. НГАБ. Ф. 2507. Воп. 1. Спр. 1710.

4. НГАБ. Ф. 2084. Воп. 1. Спр. 134.

5. Першая настаўніца народнага песняра // Народная асвета. – 1972. – № 6. – С. 53-56.

6. НГАБ. Ф. 2254. Воп. 2. Спр. 338.

7. НГАБ. Ф. 458. Воп. 1. Спр. 104.
8. НГАБ. Ф. 458. Воп. 1. Спр. 62.
9. Луппиан С. О летнем отдыхе сельского учителя // Народное образование в Виленском учебном округе. – 1906. – № 6. – С. 20–23.
10. НГАБ. Ф. 2254. Воп. 2. Спр. 678.

УДК 821.161.3–054.72

В.У. Коваль, дац., канд. гіст. навук
(БДТУ, г. Мінск)

## ЛІТАРАТУРНЫЯ ЎЗАЕМАСУВЯЗІ БЕЛАРУСКАЙ ДЫЯСПАРЫ З МЕТРАПОЛІЯЙ У 1920-Я ГГ.

Літаратура беларускага замежжа – гэта неад’емная частка нацыянальнай культурнай спадчыны. На сучасны момант праводзіцца значная навуковая праца па збору і аналізу гістарычных крыніц пра выданні, вечарыны і мастацкія праекты беларускай дыяспары. Літаратурныя кантакты беларускіх эмігрантаў з метраполяй спрыялі працэсу ўзаемапранікнення культур, наладжванню сталых міжнародных кантактаў, папулярызацыі нацыянальных традыцый. Эмігранты ў розных краінах свету шырока адзначалі юбілеі беларускіх паэтаў і пісьменнікаў, ладзілі нацыянальныя вечарыны, арганізоўвалі публічныя лекцыі па літаратуразнаўству. Нацыянальная культура мела кансалідуючую ролю для палітычных апанентаў у асяроддзі беларускага замежжа. Адной з эфектыўных форм супрацоўніцтва з еўрапейскай інтэлігенцыяй і нацыянальнай дыяспарай сталі замежныя візіты беларускіх паэтаў і пісьменнікаў. Талент і аўтарытэт літаратараў дапамагаў ім наладжваць творчыя ўзаемакантакты як з вядомымі дзеячамі культуры, так і з беларускай студэнцкай моладдзю замежжа. Каштоўнымі гістарычнымі крыніцамі пра факты сумесных культурных праектаў сталі падарожныя нарысы Цішкі Гартнага, якія захоўваюцца ў Беларускім дзяржаўным архіве-музеі літаратуры і мастацтва.

Нацыянальную культуру для еўрапейскай супольнасці прадстаўлялі грамадскія аб’яднанні, супрацоўнікі літаратурных перыядычных выданняў, вядомыя паэты, пісьменнікі і журналісты. Грамадскае аб’яднанне Беларускае таварыства культурных сувязей з замежжам вылучала асоб для міжнародных кантактаў з ліку творчай інтэлігенцыі БССР, аналізавала эфектыўнасць праектаў і іх перспектывы [1, арк. 1–54]. Адзін з першых значных візітаў беларускай творчай дэлегацыі ў краіны Еўропы адбыўся ў кастрычніку 1925 г., прадстаўнічая беларуская дэлегацыя была адпраўлена за мяжу таксама